# Прысвячаецца Вялікаму Майстру

Прастора мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» зноў ускалыхнулася чарговым міжнародным праектам – выставай жывапісу па выніках пленэру, прысвечанага 140-годдзю з дня нараджэння выдатнага мастака, акадэміка Расійскай імператарскай акадэміі мастацтваў Станіслава Жукоўскага.

Наш зямляк – вучань знакамітага Левітана, выпускнік Маскоўскага вучылішча жывапісу, скульптуры і дойлідства Станіслаў Жукоўскі – пакінуў вялікую творчую спадчыну, якая захапляе і ўражвае.

Менавіта на радзіме мастака – маляўнічай Пружаншчыне, у сядзібе «Жураўлінае», мастакі з Віцебска, Брэста, Гродна, Санкт-Пецярбурга, Масквы, Архангельска, Пяцігорска, Уладзіміра, Таганрога, Алушты і іншых гарадоў стварылі свае цудоўныя творы, што ўвайшлі ў экспазіцыю сёлетняй выставы.

Арганізаваная імпрэза адным з найбуйнейшых мастацкіх аб'яднанняў Санкт-Пецярбурга – Таварыствам перасоўных мастацкіх выставаў, створаным ў 2005 годзе з мэтай адрадзіць лепшыя традыцыі рускага мастацтва, што грунтуюцца на талентах Крамскога, Пярова, Шышкіна, Рэпіна і іншых мастакоў XIX стагоддзя.

***Павел САПОЦЬКА,***
***дырэктар мастацкай галерэі «Універсітэт культуры», выкладчык БДУКМ***



*Заслужаны мастак Расіі Аляксандр Кулемін і мастацтвазнаўца Валерый Выбаржанін*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКіМ